Самапомач Самаромаў

Беларуская кооперацыйна-гаспадарчая часопісь

Год IV. | Вільня, Студзень 1935 г. | №1.

Хай злыдні над намі,
скрыгочуць зубамі
Любі сваю ніву, свой
край,
І, колькі ёсьць сілы,
да самай магілы
Ары, барануй,
засявай!..
ЯНКА КУПАЛА.



Усе вялікія падзеі народаў і ўсе цывілізацыі былі створаныя дабравольнымі стараньнямі аб'яднаных людзей... самапамачу.
Джордж РЭССЭЛЬ
(Ірляндзец).



ЗЬМЕСТ № 1 (30).

Ceny ŭ Vilni

pavodle Centralnaha Statystyčnaha Biura z 25.I.35. Ceny za 1 kilohram.

Chleb žytni 55 prac.	0.28—0.30
Chleb žytni 75 prac.	0.22—0.25
Chleb razovy 98 prac.	0.18—0.20
Chleb pšaničny 65 prac.	0.35—0.50
Muka pšaničnaja	0.25—0.40
Muka žytniaja razovaja	0.15—0.18
Muka pitlavanaja	0.24—0.25
Miasa vałovaje	0.70—0.90
Cialacina	0.70—1.00
Baranina	0.80—1.00
Švinina	0.90—1.20
Karpy žyvyja	1.45—1.60
Karpy drobnyja	1.50—1.80
Ščupaki žyvyja	2.00—2.20
Ščupaki niažyvyja	1.00—1.50
Sielavy	1.30—1.50
Akuni (u hurcie)	0.50—0.90
Płotki	0.50—0.80
Štynka	0.40—0.50
Drobnaja ryba (u hurcie)	—0.20

Na zbažžovaj biržy płacili za 100 kilo:

Votruby žytnija	7.50— 8.00
Votruby pšaničnyja	10,00—10,50
Haroch biełу	22.00—23.00
Haroch šery	20.00—21.00
Vyka	24.00—25.00
Łubin sini	6.25— 7.00
Siena	7.00—8.00
Sałoma	5.00—5.50

Małočnaje 30.I.35.

Masła najlepšaje, za kilo ŭ hurcie	2,50
„ „ „ „ „ u detalu	2.80
Masła stałovaje za kilo ŭ hurcie	2.30
„ „ „ „ „ u detalu	2.60
Masła solenaje za kilo ŭ hurcie	2.30
„ „ „ „ u detalu	2.60
Syr navahradzki, za kilo ŭ hurcie	2.30
„ „ „ „ „ u detalu	2.80
Syr litoŭski, za kilo ŭ hurcie	1.70
„ „ „ „ u detalu	2.00
Jajki, kapa	6.00—7.20
„ štuka	0.11—0.13.

Samapomač

BIEŁARUSKI
KOOPERATYŪNA - HASPADARČY
ČASAPIS.

Adres:
VILNIA (Wilno), Połackaja vul. 4—10.

Самапомач

Hod IV.	Vilnia, Studzień 1935 h.	Nr. 1 (30).

Što budzie z kooperacyjaj?

Što budzie z kooperacyjaj?

Voś pytańnie, jakoje stavić sabie na pierałomie staroha i novaha Hodu kožny, chto tolki ŭ jakoj-kolečy miery mieŭ ci maje styčnaść z kooperacyjaj u Polščy. Stavim heta pytańnie i my biełarusy, katorych žyćciovy šrub štoraz macniej uciskaje ŭ „apiakunčyja" čužyja ramy i, zamiest pryvučać da žyćcia na svoj sobski rachunak, naviavaje maroźlivym snom na ŭsio, što zradziłasia ci tolki rodzicca biaz „prykazu"... z boku. Pry hetkich umovach usio, što znajšłosia ŭ kooperacyi vypadkova, dziela chleba, z lohkim sercam prymaje novych chlebadaŭcaŭ. Tyja ŭznoŭ, dla katorych kooperacyja była i jość źmiestam ichniaha žyćcia, pahadzicca z novymi paradkami nia mohuć i, nie dajučysia da hetych paradkaŭ nahinacca, lepš łamajucca, adychodziać... Da niadaŭna poŭny žyćcia murašnik pieramianiajecca — ŭ 90 tyja ŭhodki Ročdelu — u niažyćciovuju mašynu, jakaja ruchajecca, praŭda, jšče siłaj papiaredniaha razhonu, ale novych vartaściaŭ užo tvaryć nia moža i nia tvoryć. Bo dla hetaha patrebnaj jość volnaść ruchaŭ, a ŭ siańniašniaj aficyjalnaj polskaj kooperacyi vymahajecca tolki „słušat' i ispołniat'". I heta najsumniej...

Pierafarmavańnie polskaj kooperacyi na novy ład ŭ sučasny mament jašče ŭ poŭnym chodzie i tamu nia možna jšče vyrazna abrysavać jejnych formaŭ. Skazać tolki možna, što ahułam „konsolidacyjny" ruch, nazvany ŭžo niekim zvyčajnaj kazionščynaj, zachapiŭ blizu poŭnaściu dahetul słabiej raźvituju kooperacyju ziemlarobskuju i mienš — kooperacyju spažyŭcoŭ, katoraja — treba addać słušnaść — vykazała dahetul bolš zrazumieńnia dla svajho biazśmiertnaha prototypa — Ročdelu. Polskaja ziemlarobskaja kooperacyja, davoli słaba paviazanaja z saboj dahetul u dva hał. Sajuzy— „Zjednoczenie" i „Unja", pastanovaj Kooperatyŭnaj Rady z dnia 31.X.34 h. pavinna była złučycca ŭ adzin sajuz, što i stałasia farmalna dnia 23 listapada 1934 h. Novy Sajuz pryniaŭ nazoŭ „Związek Spółdzielni Rolniczych i Zarobkowo-Gospodarczych Rzeczypospolitej Polskiej" i ŭžo 21 śniežnia 1934 h. byŭ zaćvierdžany ŭ Ministerstvie Skarbu.

Jakim akažycca novy „supolny" Sajuz polskaj ziemlarobskaj kooperacyi, što paŭstaŭ na miescy dahet. 9-och akr. sajuzaŭ — pakaža budučynia. Jość adnak užo siahońnia šmat dokazaŭ, što novy Sajuz pierš, čym naradzicca, zaraziŭsia ŭžo spadčynaj pa svaich papiarednikach i ŭ svajej dziejnaści rachuje pierad usim na pomač z kruhoŭ kazionnych. Śviedčyć ab hetym — miž inšym — i toj fakt, što staršynioj arhanizacyjnaha Kamitetu Sajuzu byŭ vybrany staršynia ŭradavaj Kooperatyŭnaj Rady. Hetkaje ahladańnie na ŭradavyja dziejniki pazvalaje dahadvacca, što polskaja ziemlarobskaja kooperacyja i dalej, „supolnymi siłami", budzie pastaromu taptacca ŭ parohach uradavych ustanoŭ, a nie prysłuchoŭvacca da samaha žyćcia i jamu jšci nasustreč. Błahaja heta pryvyčka i niebiaśpiečnaja. Była jana, jak viedama, pryčynaj, dziela jakoj letaś dajšło da zaviadzieńnia sučasnaha kooperatyŭnaha zakonu, što hetak ścisnuŭ kooperacyju. Nia chočam być prarokami zła, ale chto viedaje, ci hetkaje ŭciakańnie da čužoj pomačy nie skasuje i astatkaŭ samadziejnaści, dziakujučy jakoj polskaja ziemlarobskaja kooperacyja siahońnia jšče naahuł kooperacyjaj nazyvajecca — chto viedaje?

Ab statucie novaha „Sajuzu", a tymsamym i jahonym ideovym źmieście, davoli vymoŭna havora „Adozva" arhanizacyjnaha Kamitetu. Skazana tam, što sprava daviadzieńnia złučeńnia da pamysnaha kanca „vymahała zračeńnia zachoŭvańnia narmalnych, paśviačanych tradycyjaj i stasavanych u kooperacyi zvyčajaŭ"... Kali hetak kaža aficyjalnaje paviedamleńnie, dyk u sapraŭdnaści ab hetym adstupleńni ad kooperatyŭnych „zvyčajaŭ" u novym kooperatyŭnym Sajuzie možna dumać i dahadyvacca musić značna bolš.

Ab tym, jak siahońnia adbyvajecca „scalańnie" polskaj ziemlarobskaj kooperacyi, viedajem tymčasam tolki z aficyjalnych paviedamleńniaŭ, u katoryja, zrazumieła reč, nie traplajuć usiakija zakulisnyja mierkavańni, ad jakich u kancy kancoŭ usio zaleža. Nie zvažajučy na heta jość znaki, jakija pakazvajuć, što heta „scalańnie" tak hładka usio-ž nia jdzie.

U ŭładach novaha Sajuzu nia bačym imion ludziej, jakija stajali pry kałyscy polskaj

kooperacyi i chto viedaje, ci ich kali pabačym tam naahuł. Viedamy jany z taho, što kooperacyju razumieli tolki niezaležnaj ad čyich niebudź našeptaŭ z boku i tamu ciažka im razburać svaimi rukami toje, što hetak achviarna doŭha budavali.—Viedajem prykłady z polskaj spažyvieckaj kooperacyi, dzie ludzi addaŭšyja dla jaje ŭsio žyćcio i stajaŭšyja na najvyšejšych jaje miascoch, zhadzilisia apošnim časam pakinuć hetyja stanoviščy, ale nie paddalisia niekooperatyŭnym u kooperacyi nakazam i adyšli... Chto viedaje, ci nia pojduć za imi i pavadyry i sapraŭdnyja zakładčyki polskaj kooperacyi ziemlarobskaj...

* * *

Pašto adnak usio heta tut havorym, čamu nas cikavić los kooperacyi polskaj?

Majem na heta dźvie pryčyny: *pieršaja*— asobna arhanizavanaj biełaruskaj kooperacyi pad Polščaj my nia majem ad 1922 h. i *druhaja* — isnujučyja na biełaruskich ziemlach kooperatyvy ŭsiakich vidaŭ zmušany naležać da sajuzaŭ polskich, ab katorych i jdzie cely čas mova.

Bujna pačaty rost kooperatyŭnaha žyćcia na biełaruskich ziemlach u paślavajennyja hady byŭ nasilna strymany pieravažajučymi siłami kooperatyŭnych sajuzaŭ polskich, syta kormlenych silnymi hetaha śvietu. Pryšli adnak hady kryzysovyja i jak tolki nia stała „kormu", nia stała sił da žyćcia i kooperatyvam, što z hetaha kormu žyli. Paru hadoŭ tamu pačataje adradžeńnie nacyjanalnaj kooperacyi biełaruskaj zmaroziŭ duch nieščaślivaje „reformy" i — miejma advahu pryznać — sobskaja niepryhatavanaść da raboty ad padstavaŭ. Hetak až da našych sučasnych dzion.

I što dalej?

Prarokami być nia možam i nia chočam. Peŭna adnak toje, što žyćcio nie astanovicca ni prad jakimi parohami, jakija kładucca jamu ŭ darohu. Znojdzie jano vychad i z hetaha sučasnaha tupika, u jaki trapiła nia tolki niearhanizavanaja kooperacyja biełaruskaja, ale i kooperacyja ŭ Polščy naahuł. Pieramožcam z hetaha tupika vyjdzie toj, chto pamima ŭsich pieraškodaŭ nia stracić łučnaści z žyćciom, nie pierastanie i na chvilinu jaho razumieć. Dziela ŭsiaho hetaha, choć vonkavyja varunki nia spryjajuć raźvićciu kooperatyŭnaha žyćcia ŭ sučasny mament, my ŭsio-ž nie pierastajom hetym žyćciom cikavicca i na dalej. I dalej budziem my sačyć za chodam kooperatyŭnaha žyćcia jak na ŭsim śviecie, tak i ŭ našym Kraju. Čytačoŭ ža našych **prosim padavać nam usie fakty z miascovaha kooperatyŭnaha žyćcia**, dziela zarejestravańnia ich i pieradačy ŭ budučyniu.

Supolnymi silami musim pieratryvać da lepšaj mahčymaści pracy.

Red.

UVAHA! Hety numar „Samapomačy" pasyłajecca jšče ŭsim tym, chto atrymoŭvaŭ jaje ŭ minułym 1934 hodzie.

Ad nastupnaha numaru pačniom stupianiova spyniać vysyłku časapisu tym, chto ŭ najbližejšym časie nia vyraŭniaje svaich daŭhoŭ za minuły hod.

Prosim prysyłać padpisku na 1935 hod.

Administracyja „Samapomačy".

Ab hadoŭli aviečak. 2)

Karmleńnie i dahlad za aviečkami:

a) uletku (praciah).

Druhoj častaj chvarobaj aviečak u roznuju paru hodu, ale najčaściej viasnoj, źjaŭlajucca rabaki (*strongili*) na lohkich. Zdarajucca taksama ŭ mokryja hady. Rabaki hetyja asiadajuć z pašy i chvaroba pakazvajecca ŭžo cieraz 6—8 tydniaŭ. Aviečka, asabliva maładoje jahnio, pačynaje, chodziačy, redka kašlać. Kašal hety spačatku karotki i suchi, paśla stanovicca čaściejšym (huściejšym), žyvioła kašlajučy vykidaje z siabie jaječki hetych-ža rabakoŭ i takim čynam sieje chvarobu kruhom. Dychańnie stanovicca ciažkim, žyvioła tracić apetyt, chudzieje i pieravažna taksama hinie. Lačeńnie ad hetkich lohačnych rabakoŭ ciažkaje i mahčymaje tolki ŭ aviečak staršych; u jahniat — nie apłacicca. Lačyć-ža moža tolki lekar-veterynar. Chatni-ž sposab lekavańnia zvodzicca da ŭžyvańnia sierki abo dziohciu, ad katoraha žyvioła pačynaje asabliva silna dychać i kašlać, vykidajučy pry hetym z siabie i samych rabakoŭ, razam z uspomnienymi ŭžo jajeckami. Sierku možna davać abo ŭ parašku (1 łyžačku dla dźviuch aviečak), dasypajučy hety parašok da kormu, abo z sierki vytvarajucca hazy, nahłytaŭšysia katorych aviečka pačynaje taksama silna dychać i kašlać, i taksama vykidać škodnych rabakoŭ. U hetym apošnim vypadku zahaniajuć chvorych aviečak u ščylnaje pamiaščeńnie, u katorym na raspalenaje žaleza ci blachu, napr. na rydloŭku (łapatu), sypiecca krycha potoŭčanaj sierki i samo pamiaščeńnie na karotki čas zamykajecca... Kali niama pad rukoj sierki, dajecca chvorym na rabaki aviečkam nadychacca nieačyščanaha dziohciu: rezultat prybliznа toj samy, što i pry siercy.

Urešcie treciaj važnaj chvarobaj aviečaj jošć haławakružeńnie: aviečka nia jdzie roŭna, ale słaniajecca, precca ŭpierad, acirajecca kala ścien, płatoŭ, abo krucicca kruhom, padaje biez ułady, paśla ŭznoŭ uspomnicca (durnieje). Pryčynaj haławakružeńnia jošć narost (šyšak) na mazhoch u-haławie abo ŭ

Сельская гаспадарка.

У чым наша бяда?

Пачынаючы новы год працы ў „Самапомачы“ і маючы ўжо ня мала практыкі з гадоў папярэдніх, можам з вялікаю пэўнасьцю сказаць, што аднэй з найважнейшых прычын галіты нашай вёскі ёсьць незразуменьне таго, чым ёсьць для народу асьвета наагул і **асьвета фаховая** перад усім. Раз за разам, ці то ў гутарках беспасярэдніх ці ў пісьмах у рэдакцыю спатыкаемся з адказам, што „перш за ўсё дайце дабрабыт, а пасьля будзем вучыцца“.

Сумны гэта адказ і кепска сьведчыць аб аб тым, ад каго ён паходзе. Сумны дзеля таго, што чалавек наш сапраўды дажываецца часам да такога стану, што ня мае чаго ўлажыць за губу. Але як-жа часта гэткая галіта ёсьць якраз насьледкам таго, што чалавек не дзеля таго галадае, што хлеба наагул ня мае, а дзеля таго, што ня ўмее вырахаваць сваіх запасаў і спачатку пускае ўсё бяз меры, а пасьля... агледзіцца, ды ўжо бывае позна.

А што-ж гэта ёсьць калі не нястача асьветы?

Бяда была-б небядой, калі-б чалавек хоць сазнаваў патрэбу паправы: дарогу да яе ён пры ахвоце тады знайшоў бы. Аднак як-жа рэдка яшчэ гэта бывае. Найчасьцейшым адказам ёсьць: „бацькі-дзяды гэтак жылі, пражывём і мы“... Ці ж трэба яшчэ даказваць няправільнасьць такога пагляду? Як інакшым было жыцьцё яшчэ дзесяць гадоў таму назад і якім яно ёсьць сягоньня! І ці-ж сапраўды можна гаспадарыць так, як „гаспадарылі дзяды?“

Дзень ад дня становіцца цяжэйшым да пражыцьця. І бязумоўна прыходзіць дзень, калі ня можна будзе кроку ступіць «так, як жылі дзяды“. Што-ж тады мы будзем рабіць мы, што ня маем школ, ані свае роднае фаховае арганізацыі, мы, што сягоньня ўжо дзеля гэтай самай прычыны ня можам прыгатаваць тавару такога, якога жадае добры рынак?

Дзеля гэтага ня можна паверыць, што нам не патрэбна асьвета, ці што нам больш патрэбны іншыя жыцьцёвыя патрэбы, і што „навука ня заяц — у лес не ўцячэ“. Гэтага не гаварэма, бо

няма народу асьвечанага,
які быў-бы бедным.

І наадварот —
бедны народ заўсёды
і ўсюды ёсьць цёмным.

Як падняць асьвету?

Найпрасьцейшая і найлепшая дарога да асьветы гэта школа і арганізацыя. На жаль, і адно і другое сягоньня для беларусаў мала даступнае. А калі нейдзе такая школа ці арганізацыя ўжо працуе, дык вучыць яе тут ня зьбіраюся. Затое для тых, што дагэтуль ані ў школе, ані ў арганізацыі ня вучацца раджу ад душы просты і даступны спосаб:

у нядзелі і сьвяткі канешна, а па магчымасьці і раз ці два ў будні дні стала зьбірацца дзеля супольнага чытаньня і талкаваньня над прачытаным.

---

chrybietnicy. Narost hety paŭstaje z zarodku sabačaj hlisty (solitera); jon ciśnie na mazhi i hetym mučyć napadzienuju žyviołu. Lačyć chvoruju ŭžo žyviołu moža tolki lekar-veterynar (operacyja). Haspadar-ža moža i pavinien tolki ścierahčysia chvorych sabak, jakija adny tolki mohuć hadavać u sabie ŭspomnienaha solitera.

Karmleńnie i dahlad za aviečkami: b) ŭ z i m k u. Haspadary našy ahulna pierakanany, što najlepšaje siena i naahuł paša ŭ haspadarcy pavinny być praznačany dla aviečak. Praŭda heta adnak tolki na hetulki, što aviečcy nia možna davać siena z mokrych łuhoŭ, bo na takim sienie byvajuć zarodki vyšej-uspomnienaj zarazy m a t y l i c y, što aviečka naahuł za dobraje siena patrapić dobra adudziačycca dy što dobraha muroźnaha siena patrabuje małodoje jahnio. Jnakš ža aviečka i ŭ zimovym karmleńni — heta najskramniejšaja chatniaja žyvioła. Asnaŭnoj jejnaj pašaj uzimku moža być sałoma, asabliva jaravaja, aby tolki była zdarovaj i niezapleśniŭšaj. Rachujuć pry hetym, što aviečka, kali budzie ŭdoval mieć sałomy da pierabirańnia, dyk za adnu paru (sutki abo 24 hadziny) patrapić vybrać z jaje hetulki kormu — kałaski i drobnyja ściabliny — jak byccam atrymała 1 kilohram siena. Hetu zdolnaść aviečak vykarystoŭvajuć u haspadarcy tak, što ŭsia sałoma, praznačanaja na padścilku, nasampierad dajecca nanač aviečkam da pierabrańnia i tady tolki ścielicca ŭ hnoj. Aprača taho źjadajuć aviečki hetak sałomu łubinnuju i miakinu. Harochviny i baboviny — heta ŭžo aviečcy prysmak. Da sałomistaj pašy treba dadavać aviečcy sačystych akopninaŭ, najlepš—karmovaha buraka, morchvy, bručki, a taksama i bulby (drobnaj), adabranaj pry pierabirańni.

Usio heta pryniaŭšy pad uvahu, dziennuju porcyju dla našaj drobnaj aviečki možna sastavić pryblizna hetak: paŭkilo siena abo harachvianaj, kaniušynnaj ci seradelanaj miakiny; da hetaha 1 kilo karmovych burakoŭ, bručki, morchvy abo paŭkilo bulby. Nanač-ža zadajecca aviečcy ŭdoval sałomy, jakuju ad-

Апекуймася птушкамі!

Мала хто прадстаўляе сабе, як-бы выглядала жыцьцё гаспадара-земляроба, калі-б раптам з нейкіх прычын ня стала на сьвеце перад усім дробных нашых птушак-сьпявуноў. Не дзеля таго, што замоўклі-б вясной гаі нашы і сады, а дзеля таго, што сады гэтыя і агароды найпраўдападабней зусім аказаліся-б зьнішчанымі тым мноствам усякіх мошак, кузурак і рабакоў, якія зьяўляюцца кормам для гэтых птушак. Проста трудна паверыць, колькі ўсякіх гэтых шкоднікаў пажыраюць нашы птушкі сьпявуны за адно лета, асабліва ў пару, калі вырастаюць маладыя птушаняты. Вырахавана напрыклад, што адна пара сініцаў за лета зьнішчыць аж 250 кілёграмаў (каля 16 пудоў) усякай шкоднай жамяры (інсэктаў: мушак, рабакоў, матылёў і г. п.). Іншымі славамі, кожная страта аднэй сініцы павялічвае лік рабакоў у садзе і агародзе на 8 пудоў у год. А колькі гэтыя 8 пудоў жамяры зробяць шкоды?...

З птушак, што карысны чалавеку паяданьнем шкоднай жамяры, трэба ўспомніць аб ластаўках, плісках, жаўранках, мухалоўках, сініцах, шпаках, перапёлках, а нават — варонах і крумкачох. Усе гэтыя птушкі нішчаць або самую жамяру, або іхнія зародкі, як гэта робяць напр. вароны, ходзячы за плугам—і таму заслугоўваюць з боку чалавека на апеку і абарону. Апека над некаторымі птушкамі, напр. жаўранкамі, ластаўкамі сталася ўжо няпісаным законам. Іншыя аднак птушкі дагэтуль за сваю службу для чалавека маюць адну толькі чорную няўдзячнасьць, а нават церпяць прасьлед.

Вось-жа для дабра самага чалавека трэба пашырыць апеку над усімі карыснымі птушкамі. Апека гэткая мусіць ісьці ў двух кірунках: па першае, пазволіць птушкам свабодна жыць і размнажацца, а тым самым не пазваляць дзецям нішчыць гнёзды, выбіраць з іх яйкі і самыя маладыя птушаняты; па другое — памагаць птушкам у цяжкі для іх час жыцьця, перад усім узімку, калі ўсё кругом пакрыта сьнегам. У гэты час трэба канешна памагчы птушкам-сьпявуном, падкормліваючы іх у зацішным месцы ўсякімі астаткамі з гаспадаркі, як крошкі хлеба, пасьлядзі зярнят, скуркі ад саланіны і г. д. Усё гэта трэба прад тым добра высушыць, а над самым месцам кармленьня трэба канешна зрабіць стрэшку, каб корм не засыпаўся сьнегам. Да таго-ж, да месца корму ня могуць меца доступу каты. Практычна ўся гэта справа вырашаецца так, што для падкормліваньня птушак робіцца стол разьмеру

На такое супольнае чытаньне не патрэбны ніякія арганізацыі ні дазволы, калі толькі чытаюцца кніжкі і часапісы адкрыта выходзячыя і цэнзурай несканфіскаваныя. Дзеля таго, што пошта сканфіскаваных кніжак і газэт не аддае, дык усё што праз пошту прыходзіць, можна вольна чытаць і пашыраць.

Дык астатак зімовых вечароў не марнуйма на пустых забаўках, але выкарыстайма іх для павялічэньня веды — веды агульнай і веды фахова земляробскай.

Будзьма добрымі гаспадарамі!

Сымон Ла—віч.

Баранавіччына.

---

nak nia možna ścialić im prosta pad nohi, ale treba zakładać jaje za drabinki. Tolki drabinki takija (jaśli) dla aviečak musiać być nizkija, kab z ich ničoha nie ciarušyłasia aviečcy na chrybiot u voŭnu.

Dziela taho, što arhanizm kažuchovaj aviečki na pradukcyju samaj voŭny patrabuje roznajakaha białka, a pierad usim *kieratynu* i *cystynu*, najlepšaj pašaj dla takoj aviečki jość miešanka: łubinu, aŭsa, jačmieniu, lanoha makuchu dy ŭspaminanych užo — siena, sałomy i akopninaŭ. Asablivuju vartaść u karmleńni aviečak maje łubin (ziarnio): raz što jon najtaniej zvyčajna prychodzicca, a paśla — aviečka pryzvyčajenaja da łubinu jeść jaho biez papiaredniaha adharyčeńnia. Adnu tolki reč treba pry hetym pomnić: paru hadzin prad padavańniem łubinu i hetulki ž času paśla kormu tym-ža łubinam nia možna davać aviečcy vady, bo ŭ praciŭnym razie ŭ aviečki moža nastać uzdućcio. — A kali ŭžo hetkaje niaščaście stałasia, dyk nia raz pamahajuć joj ad uzdućcia masažy (nacirańnie) levaha boku.

Aviečka byvaje kotnaju pryblizna 150 dzion, choć hety čas nie zaŭsiady roŭny i pasuvajecca ad 145 da 160 dzion. Za tydniaŭ šeść prad akočvańniem musić aviečka-matka dastać dadatak na raźvićcio płodu: dajecca ŭ dzień pa 10 deka (1 kilo na 10 štuk) miešaniny roznych paśladziaŭ, muki, votrubaŭ ci makuchaŭ. Para dzion paśla akačeńnia i praz ceły čas, pakul aviečka soić jahnio, pavinna dastavać zbolšanuju porcyju paśladziaŭ (pa paŭfunta), a porcyja małakahonnych akopninaŭ (tolki nia bulby!) pavialičvajecca da $1^1/_2$ kil.

Pry skormlivańni aviečkami bulby treba pamiatać, kab plemnaj aviečcy nie davać bolšaj porcyi jak čvierć kilohrama ŭ dzień. Pry bolšaj porcyi aviečka pačynaje tłuścieć, a praz heta ŭstrymlivajecca ŭ jaje płociavy hon i jana nia tolki dvojčy, ale navat i razu ŭ hod nia moža akacicca. A heta ŭžo vialikaja strata.

Aviečki praznačanyja na zarez padkarmlivajucca asobna, dajecca im bolš siena, mienš sałomy, 1—2 kilo bulby abo ŭdvaja bolš karmovych burakoŭ i na abmiešku — 20—30 deka (čvierć kilo) razovaj muki abo i votrubaŭ.

Якія цяляты пакідаць на плем.

Цяляты або маладняк—гэта будучая карова, таму трэба ўсімі сіламі старацца, каб яны былі найлепшымі; трэба пакідаць на плем самыя найлепшыя і найздаравейшыя цяляты і даглядаць іх як трэба, каб дачакацца з іх добрых кароў. Цялят неадпаведных, натуральна, гадаваць ня можна; іх трэба падкарміць і на другі тыдзень прадаць на мяса.

У нас людзі часта пры гэтым ашуківаюцца і таму маюць вялікія страты. Зьяўляецца пытаньне, колькі цялят выховываць у гаспадарцы? Часта выхоўвуюць у нас цялят за шмат, хоць гэтыя цяляты і благія; толькі па даўжэйшым часе гаспадар апомніцца, што ня мае корму і прадае цялят, не дагадаваўшы іх, з вялікаю стратаю. Гэта нас руйнуе.

Калі не пабольшываем нашай гадоўлі кароў і не выбракоўвуем іх, дык гадуемо ня больш аднаго цяляці на дзесяць кароў. Якія-ж цяляты добрыя? На першым месцы пытаемся, па якіх бацькох гэта цялё. Якое зярнё, такі й плод. Так і тут, толькі ад добрай каровы і добрага бугая (быка) можа быць добрае цялё. А таму трэба гадаваць цяляты ад найлепшых кароў, здаровых, дасьпелых у веку, якія даюць шмат і клустага малака, пры тым самі лагодныя, не за надта пераборлівыя, якія акуратна бываюць цельнымі (ня бываюць ялаўкамі і добра — лёгка целяцца). Таксама трэба знаць бугая, каб ён быў здаровы, каб пахадзіў з малочнага роду, каб ня быў за малады і ня быў пасваячаны з нашай каровай. Але ня толькі на прыметы бацькоў зьвяртаем увагу, але і на дзядоў — прадзедаў нашага цяляці. Чым больш мае яно продкаў ведамых з сваіх добрых прымет, тым яно лепшае, тым больш надзейнае.

Бачымо тут, як важнымі ў жывёлагадоўлі ёсьць запіскі або мэтрыкі. Пытаюцца ня раз людзі, ці можа быць добрае цялё ад пяршачкі; трэба ведаць, што можа яно быць і добрае і вырасьці на найлепшую карову, але толькі тады, калі пяршачка была ў адпаведна — сьпелым веку прыпушчана да бугая... Але гэткая пяршачка — як гэта ў нас бывае — што йшчэ будучы цялём да двух гадоў, сама ўжо мусіць цяліцца — напэўна добрага цяляці ня дасьць.—Гэткія вымогі ставімо для бацькоў і продкаў жывёлагадаўлянага прыплоду. Але і на сам прыплод мусім яшчэ зьвярнуць увагу, на яго будову, правільны рост, масьць і г. д., бо і ад зусім добрых бацькоў можа часам нарадзіцца прыплод, які да хову не надаецца. Насамперш трэба нованароджанае цялё зважыць — з гэтым у нас найцяжэй; цялё мусіць важыць прынамсі $^1/_{12}$ і найменш $^1/_{14}$ часьць вагі сваей маткі. Калі яно важыць яшчэ менш, то пускаць яго на плем ня можна. Вось-жа, як бачым, важнай ёсьць справай ведаць вагу каровы і адначасна зважыць самае цялё. Цяпер заглянем таксама цяляці ў зубы; у добрага цяляці бачым ужо

больш-менш 50×50 см., на аднэй назе, вышыня якой больш-менш паўгара—два мэтры.

Усякія дальшыя апісаньні ў гэтай справе лішнія. Кожны, хто хоча памагчы галоднай птушцы — спосаб на гэта знойдзе А птушка адудзячыцца за гэта вясной і летам у многа разоў.

Я. Ч.

Chlavy dla aviečak. Aviečka, jak i ŭsialakaja žyviola, patrabuje dla svajho žyćcia nia tolki kormu dy pićcia, ale taksama ruchu i śviatła. Uletku z hetym biady mała. Horš z hetym uzimku, kali aviečka zamykajecca ŭ chlavie. Kažuchovaja aviečka — a my tut cely čas ab hetkaj aviečcy havorym — nie patrabuje chlava lišnie ciopłaha, ale zatoje śvietłaha i prastornaha. Temperatura ŭ takim chlavie nikoli nia moža padymacca nad 12°C. Što datyča prastoru, dyk rachujuć na adnu aviečku pa 0.70 kvadr. metra (na 10 aviečak 7 kvadr. metr.) pry vyšyni chlava nia mienš 3 metraŭ. Buhajbaran pavinien stajać asobna i mieć prastoru nia mienš paŭtara kvadr. metra.

Vakno ŭ chlavie — heta adzin z najpeŭniejšych pakazčykaŭ haspadarskaj kultury. Ale tolki ŭ tym vypadku, kali jano nie pazatykana anučami, a jak naleža zašklona i čysta ŭtrymana, kab praz jaho dastavałasia ŭ chleŭ soniečnaje śviatło. Patrebna hetkaje vakno i ŭ chlavie aviečym, z paŭdzionnaha ci z zachadniaha boku. Uletku takija vokny majuć być stała adčynienymi, ale na zimu treba ich dobra i ščylna ahledzić, bo aviečka nadta baicca praciahaŭ (skraźniakoŭ). Dziela hetaha treba dobra abhledzić na zimu nia tolki vokny, ale taksama pazatykać ŭsiakija dziury i špary, dzie tolki takija mohuć być: u padmuroŭcy, u ścienach, u dźviarach. Havoračy ab šparach, nia možna zabycca ab takich šparach u stoli (stalavańni). Tut adnak nie dziela praciahu, ale dziela taho, što praz hetkija špary syplecca zvyčajna ŭsiakaje śmiaćcio, jakoje brudzić aviečuju voŭnu.

Ab žłaboch była ŭžo mova vyšej. Tut tolki dadadziom, što pavinny jany być prastornymi, kab aviečki pry ich nie aciralisia kala siabie bakami. Asabliva heta niebiaśpiečna dla aviečak vysoka kotnych. Žłaby—kali aviečki naahuł z žłaboŭ kormiacca—treba pa kožnym kormie, a prynamsia kožny dzień da čysta vyčyścić z astatkaŭ pašy, a čas-ad-času i pabialić vapnaj.

Padścilka dla aviečak miakkaj być nia musić, ale kanieśna musić być suchoj i čystaj.

(d. b).

V. Ach—vič.

у дольнай ськівіцы спераду 8 зубоў, 4 сярэднія ўжо вырэзаныя, а 4 крайнія паказваюцца. Калі гэтых зубоў сусім ня відаць, знача цялё ёсьць слабай будовы. Так бывае ў цялят прадчасна народжаных (неданошаных) і такіх ня варта пакідаць на плем, але іх трэба прадаць. Часам трапляюцца ў каровы блізьняты; гэтых цялят таксама ня можна пускаць на плем, бо з іх вырастаюць звычайна благія каровы. Другі раз трэба зважыць цялё па 6-цёх тыднях; у гэту пару вага цяляці мусіць падвоіцца, калі яно было добра гадаванае, здаровае, добра расьце й разьвіваецца. Калі-ж пакажыцца, што вага не падвоілася, дык трэба лепш гадаваць і даглядаць цялё — даць яму больш малака; але калі цялё было добра гадавана, дык прычына знаходзіцца ў няправільным разьвіцьці і тады трэба цялё чым хутчэй прадаць. Таксама трэба вызбыцца як найскарэй цяляці кволага, або змучанага доўгай нястраўнасьцю, якую ня можна вылечыць.

Што да пары году, дык трэба ведаць, што найлепшыя цяляты тыя, што родзяцца ўвосені і зімой; яны найсільнейшыя і пры тым узімку іх можна добра выгадаваць, а вясной пойдуць яны на пасьбішча, якое вельмі добра ўплывае і на разьвіцьцё і на здароўе. Вясьняныя і летнія цяляты ніколі ня маюць так добрых варункаў жыцьця ў першыя часы свае моладасьці.—Таксама будова цяляці зразу па нараджэньні паказвае нам на ягоную вартасьць. Трэба пускаць па плем цялё добра збудаванае; галава павінна быць малая, шыя мерная, крыж роўны, шырокі, ногі простыя, ня выкрыўленыя. Калі глядзець з-заду, пярэднія ногі павінны пакрывацца з заднімі. Суставы павінны быць шырокія. Жывот (бруха) мае быць не замалое, але і не завялікае, скура тонкая і элястычная (мяккая), поўсьць густая і бліскучая. Цяляты з надта тоўстым задам ня добрыя, бо гэта азнака іх нахілу да перарабляньня пашы на тоўшч, а не на малако. Затое гэткае цялё прададзенае на мяса дасьць добрую цану.

Цяляты, якіх ня выхоўвуем, трэба ў другім тыдні прадаць. Даўжэй трымаць ніколі ня варта, бо тады малако больш каштуе чым прырост цяляці. Але за гэтых пару дзён трэба даць цяляці належнае мноства малака, каб цялё было поўнае і харошае, бо тады цана будзе вышэйшая і пакрые нашы выдаткі.

Інж. Р. Я.

Як ратаваць зьмерзлае дрэва ў садзе.

Сёлетняя зіма, праўда, дагэтуль страшнай ня была, але канец яе йшчэ далёка і хто ведае, які ён будзе. Ня лішнім дзеля таго будзе падзяліцца тут коратка з чытачамі „Самапомачы" тымі радамі, якія даволі добра памагалі пасьля марознай зімы ў 1928-29 г.

Зьмерзлае садовае дрэва на вока пазнаецца па тым, што кара яго пачарнее і прысохне. Чым больш гэткіх месц, тым горш для дрэва. Найгорш-жа тады, калі чорныя плямы на кары абхватываюць дрэва кругом, адным ці нават некалькімі сплашнымі паясамі, нават калі гэтыя паясы і ня так ужо шырокія. У такім разе пераход сокаў ад карэньня дрэва да кароны цалком прарваны і дрэва сохне, нават калі карона яго была-б сусім здаровай. І наадварот, калі на дрэве пацярпеўшым ад марозу ёсьць хоць вельмі вузенькі, нават ня просты (вужыкаГаты), але беспрарыўны жывы паясок кары ад карэньня да лісьця, дык ратунак такога дрэва магчымы.

Як-жа гэта рабіць?

Перад усім сукі (галіны), што зусім зьмерзьлі, цалком абрэзваюцца. Шчарнеўшая кара таксама зразаецца вострым нажом да таго месца, пакуль не пакажыцца кара жывая, ясна-зялёная. Зразаньне зьмерзлай кары мусіць быць старанным; пакіданьне хоць малой часьці зьмерзлай кары перашкаджае зарастаньню і выгайваньню ўсей раны.

Усякія раны, што паўсталі пасьля абрэзваньня зьмерзлых сукоў і кары старанна замазываюцца ўшчаповай масьцю і абвязваюцца. Масьць гэта вельмі добра лечыць усякія раны і калі яны не асабліва вялікія, дык выздараўленьне магчымае за адно ўжо лета.

Горш прадстаўляецца справа, калі абмерзла кара кругом дрэва. У гэткім выпадку найчасьцей няма іншай рады, як дрэва сьпілаваць аж пад тое месца, дзе кара кругом абмерзла і новае дрэва выводзіць з таго сука, які астаўся ніжэй гэткага месца сьпілаваньня. Калі-ж такога сука ніжэй абмерзлага месца няма, дык стасуюць „штучнае кармленьне": штучным спосабам злучаюць пень дрэва з ягонай каронай. Робіцца гэта пры помачы падвойнага шчапленьня —адзін канец (грубшы) здаровага і доўгага сука зашчэплівае пад кару ніжэй зьмерзлага месца, а другі — вышэй. Гэткіх сукоў даюць 2—3, а нават і больш. Работа гэта ня лёгкая. Асабліва цяжка бывае прышчапіць верхні канец сука (над ранай)...

Па 3—4 тыднях трэба пашкоджанае дрэва абглядзіць на нова, ці ня мае йшчэ пачарнеўшых плямаў на кары і калі б гэткія знайшліся, дык трэба іх вырэзаць так, як ужо гаварылася вышэй.

Сільна пацярпеўшыя дрэвы за адзін год звычайна не пасьпяваюць ачуняць і патрабуюць даўжэйшай апекі: чулыя яны асабліва на новыя маразы і з гэтым трэба рахавацца. Цалком выздаравеўшым ёсьць такое дрэва, якое ўлетку мае ўзноў поўна-зялёнае — а ня сьветлае — лісьцё.

В. Р.

Як падняць плоднасьць садовага дрэва.

У нашых садох ёсьць шмат малавартасных дрэваў, якія аднак пры адпаведным даглядзе маглі-б яшчэ добра радзіць. З вялікага ліку ўсякіх на гэта спосабаў, успомнім тут толькі аб адмаладжваньні і аб перапрышчэпліваньні.

Адмаладжываньне можна стасаваць да яблыняў і да йгрушаў, і ня можна яго стасаваць да сьлівак, вішняў і наагул да пладовых дрэваў гэтак званых кастковых, бо яны пры гэтым выдзяляюць з сябе вельмі шмат „гумы“ і ад высіленьня гінуць.

У засадзе адмаладжваньня патрабуе кожнае пладовае дрэва, якое па нейкім часе само перастае расьці, а плады становяцца штораз драбнейшымі. Патрэбнае ў такім разе адмаладжваньне палягае на тым, што скарочваюцца ўсе галіны дрэва на адну траціну, а часта і на палову іхняй даўжыні. Ад гэткага скарочваньня сіла жывучая ўсяго дрэва, якая прад тым дзялілася на цэлую даўжыню сукоў, пасьля скарочаньня гэтых апошніх з канешнасьці згушчаецца на прастор значна карацейшы і таму дзеіць з большым разгонам. З вяршынак скарочаных сукоў прарастуць новыя галінкі, а ніжэй паказваюцца плоданосныя пучкі цьвету.

Адмаладжываньне пладовага дрэва выконваецца раньняй вясной, перш чым насьпеюць на ім пупушкі (покаўкі). Калі-ж так станецца, што з работай гэтай крыху прыпозьнімся, дык трэба вынагарадзіць тэта увагай пры самой працы: ськідаючы абрэзаныя галінкі трэба сьцерагчыся, каб не паабціраць насьпеўшых ужо ў тую пару пупушак.

Скарочваючы пры адмалоджваньні сукі жывыя, трэба, натуральна, выразаць цалком сукі сухія. Калі-ж бы які сухі сук міма ўсё гэта астаўся незаўважаным, трэба яго зрэзаць пасьля, як усе жывыя сукі пакрываюцца зеленьню.

Год спусьціўшы пасьля адмалоджваньня трэба загусьцеўшую карону дрэва нанова пераглядзіць і выкінуць з яе ўсё лішняе суччо, што толькі замінае доступу сонца і паветра, а пакінуць толькі сукі найлепш разьвітыя.

Другім з колеі спосабам абнаўленьня пладовага дрэва ёсьць **перапрышчэпліваньне**. Робіцца яно тады, калі гатунак дадзенага дрэва не адпавядае ці то вымогам мясцовых клімэтычных варункаў, ці гандлю, ці ўрэшце асабістаму смаку. Чым дрэва маладшае, тым такая опэрацыя больш пэўная. Выглядае ж уся справа гэтак:

Усе галіны (сукі) дрэва сільна скарочваюцца і ў месца абрэзу кожнай галіны прышчэпліваюцца 2, 3, 4 і больш галінак жаданага сорту. Прышчэпліваньне пераважна робіцца спосабам гэтак званага клінаваньня. Чым грубейшы сук, тым больш укладаецца галінак прышчэпу. Удача гэткага перапрышчэпліваньня залежа ад пагоды і ў выпадку зімнага, пахмурнага лета, выстаўляе дрэва на небясьпеку розных хваробаў.

Каб новапрышчэпленыя галінкі не абламаліся ад ветру, або каб іх не абламалі птушкі, да скарочаных галін самага дрэва, у месцы прышчэпу,прывязваюцца доўгія шчэпкі.

Абрэзваньне сукоў пладовага дрэва як пры адмалоджваньні, так і пры перапрышчэпліваньні раптоўна зьмяншае колькасьць лісьця на дрэве і гэтым самым выстаўляе само дрэва на сільныя ўнутраныя зьмены. Дзеля гэтага трэба з асаблівай ўвагай сьлядзіць, каб не пашкодзіць лісьця на прарастаючых атожала і ў першых пару гадох не абрэзваць іх, а толькі скарочваць да даўжыні 10—15 см.

Некаторыя ўзноў практычныя садоўнікі проста ня радзяць абрэзваць адразу ўсе сукі, за адзін год, як пры адмаладжваньні, так і пры перапрышчэпліваньні, а раскладаць гэту працу на некалькі гадоў: тады дрэва гэтак не адчуе цяжкай на сабе опэрацыі і лягчэй яе вытрымае.

Да перапрышчэпліваньня таксама прыгодны толькі яблыні і йгрушы і ня прыгодны да гэтага дрэвы пладоў кастковых, як вішня, сьліва і інш. дзеля прычын вышэй пададзеных.

В. Р.

Як гадаваць морхву і яе сарты.

Гадаваньне морхвы, таксама як бурака, вельмі пашырана, асабліва каля вялікіх гарадоў. Дзе-ня-дзе сеюць і гадуюць морхву на экспорт. Морхва належыць да акопных расьлін і для гадаваньня яе патрэбны тыя самыя вымогі, што і цукровага бурака. Што да клімату, дык морхва мала пераборлівая. Зямлю любіць лёгкую, пяскаватую, або лёгкую гліну, ня надта сухую, але й не падмоклую. На грунтох цяжкіх дае ўраджай горшай якасьці; „карэньне“ мае патрэсканае і дзеля таго кепска перахоўваецца ды гніе. Морхва ня любіць сьвежага хлеўнага гною, таму трэба яе сеіць толькі ў другім годзе пасьля ўгнаеньня.

Раньнія сарты морхвы можна сеяць вельмі рана, як толькі зыйдзе сьнег і зямля абсохне. Можна яе сеяць і пазьней, у м-цы траўні (май), але ўраджай тады будзе значна меншы, расьліна мае замала часу, каб магчы як трэба разьвіцца.

Сеюць морхву і пад зіму, у канцы м-ца кастрычніка. Раней на зіму сеяць морхву ня можна, каб насеньне не абышло йшчэ ўвосені. Морхва, пасееная ўвосені, узыйдзе вясной вельмі рана. Трэба аднак памятаць, што ўвосені можна сеяць морхву толькі на грунтох лёгкіх, знача на такіх, на каторых вясной,

як сойдзе сьнег, ня творыцца скарынка, бо ў праціўным разе морхва ўсходзіць цяжка або і гніе. Морхва вымагае зямлі добра вырабленай. Найлепш сеяць морхву радкамі, у адлежнасьці 30—40 см. адзін ад другога, залежна ад таго ці поліва будзе ручное (матыкай), ці машыновае.

Калі хочаць, каб морхва, пасееная вясной, скарэй абходзіла і гэтым самым хутчэй паказвалася на варывенным рынку, можна прарастаньне насеньня ўскорыць, перамешваючы яго перад пасевам яшчэ з вогкім пяском і ставячы ў цёплым месцы. Трэба аднак зьвярнуць увагу на тое, каб насеньне пры гэтым толькі бракла (пучылася), але не прарастала. Гэтак прыгатаванае насеньне трэба высяваць у сам дождж або беспасярэдна пасьля дожджу, бо ў разе сухасьці гэтак прыгатаванае насеньне церпіць яшчэ больш, чым насеньне зусім непрыгатоўванае, сухое.

Морхва пачынае ўсходзіць за два—тры тыдні пасьля засеву. Абыйшоўшую морхву трэба адразу палоць паміж радкоў і прарываць у самых радкох. Пульхная зямля вельмі карысна ўплывае на разьвіцьцё морхвы. У радкох пакідаецца морхва адна ад другой у адлежнасьці 5—8 см., а пасьля прарэджваецца йшчэ другі і трэці раз.

Першы збор морхвы, нават пры вельмі раньнім засеве, можа быць толькі ў м-цы ліпні. Можна яе зьбіраць з поля або ўсю разам або ступянёва, у меру як паасобныя расьліны разьвіваюцца, выбіраючы спачатку большыя і пакідаючы меншыя да восені, каб маглі падрасьці.

Морхва засееная на землях бедных, на пяскох, хоць-бы навет найраней, разьвіваецца слаба і ня так скора, а гэтым самым можа даць ураджай толькі ўвосені. Далікатныя сарты морхвы, як толькі поўнасьцю ўжо вырасьлі, трэба зьбіраць з поля, бо калі пакінуць яе ў зямлі на даўжэйшы час, дык пачынае трэскаць, гніе, а тым самым кепска перахоўвуецца праз зіму.

Морхву можна сеяць разам з радысай у цёплых або зімных інспэктах ужо ў м—цах лютым — сакавіку. Пасьля выбару радысы морхва разрастаецца і дае не благі ўраджай вельмі рана, тады калі можна дастаць за яе на рынку яшчэ найлепшую цану. У інспэктах сеецца морхва з рукі, шырока, рэдка.

Пры выкопываньні трэба морхву асьцярожна ачышчаць з зямлі, каб не калечыць карэньня. Наць (лісты), акрамя некалькіх сярэдніх лісткоў, адкідаецца. Перахоўваецца або ў пяску ў скляпох (паграбох), або прысыпаецца пяском і закопываецца зямлёй. Зімой час-ад-часу трэба заглянуць да морхвы, ці яна не пачынае гніць і надгніўшую трэба зараз-жа выкідаць.

Тут трэба ўспомніць і аб некаторых сартох морхвы, што з увагі на сваю ўжытковую і гандлёвую вартасьць стаяць на першым месцы і гадаваньне каторай дзеля гэтага найбольш пашырана.

1. Парыская морхва — каротка я — раньняя, найлепш прыгодная да гадаваньня ў інспэктах. Па форме сваей яна малая, вельмі кароткая, блізу круглая. Сеюць яе таксама проста на груньце, але да гэткай гадоўлі на большых прасторах яна мала прыгодная, бо скора дасьпявае і ў час ня выкапаная, трэскае ўздоўж, загніваецца і псуецца. Як кухоннае варыва, што да ядомае вартасьці, галоўным чынам колькасьці цукру, гэты сорт бесьпярэчна стаіць на першым месцы.

2. Морхва „Дувіцкая" — падобная да парыскай, але крыху большая, больш адпорная, лепш прыгодная да ўправы на вольных грунтох. Яна таксама даволі раньняя.

3. Морхва паўдоўгая, нантэйская. Мае карэнь валкаваты, гладкі, роўны. Мякіш цэгляна-чырвонага колеру; сорт гэты мае на таргох выробленую марку, вельмі распаўсюджаны, прыгодны да пасеву на большых абшарах (на полі). На якасьць грунту менш пераборлівыя чым сарты папярэднія. Некаторыя сарты морхвы з віду і падобныя да нантэйскай, але ей не дапісваюць.

4. Морхва доўгая сьв. Валерага. Мае карэнь даўгі, конусаваты. Морхва гэтага сорту хоць непераборлівая, але плодная. Як кухоннае варыва ўжываецца датуль толькі, пакуль маладая, а пасьля толькі як паша і таму на рынку яна мае слабы попыт.

5. Морхва пашная зялёнагаловая. Гэта найбольшая з морхваў, белая, доўгая, цыліндрычная (круглая). Тая часьць, што расьце над зямлёй — зелянее. Сеюць яе адну, самую, або ў перамешку з яравым збожжам. Як корм для жывёлы, морхва гэта вельмі карысна, бо ў кароў збольшуе ўдой малака.

інж. Б. П.





Redaktar-Vydaviec inž. A. KLIMOVIČ
Z upavažnieńnia Bielaruskaha Instytutu Haspadarki i Kultury ŭ Vilni.

Bielaruskaja Drukarnia im. Fr. Skaryny, Vilnia, Zavalnaja 1—3.

Попел — добры гной.

Што попел ёсьць гноем і да таго — гноем добрым, аб гэтым ведае сягоньня бадай кожны наш гаспадар і гаспадыня. І аднак гэты попел так марнуецца, як быццам ён нічога ня варты. Сям-там яшчэ можна пабачыць, як гаспадыня высыпае попел пад паветку, у хляўны гной, але найчасьцей ён высыпаецца проста „на ўзьвей вецер“, на гарод, у сад і г. п. Трацяцца пры гэтым гнойныя вартасьці попелу на заўсёды, бо попел тады толькі прыносе карысьць, калі ён бывае належна перахаваны і застасаваны. Што-ж гэта знача?


Насамперад гнойную вартасьць мае толькі попел з дрэва, а ня мае гэтай вартасьці попел з вугля: гэты апошні нават шкодны, бо мае ў сабе серку.

Кожнае мноства попелу, калі з яго хочам мець карысьць, ня можна асобна нікуды разсяваць, ані высыпаць, але трэба перад усім абгасіць, добра астудзіць і ссыпаць у асобную бочку ці скрынку, дзераўляную, а йшчэ лепш — у бляшаную ці хоць-бы толькі бляхай з сярэдзіны выбітую. Гэткая бочка мусіць мець века, якое стала павінна быць закрытым. Акрамя таго бочка гэта павінна стаяць у месцы забясьпечаным ад зацяканьня ўсякай вады і наагул ад вогкасьці.

Гэтак толькі зьбіраны і перахоўваны попел можа быць выкарыстаны ў поўнай вартасьці. Прыгодны-ж попел як пад азіміну, так і пад ярыну, а так-жа і на сенажаці. Пад азіміны рассыпаецца попел ужо прад самай воркай папару і зараз-жа заворваецца. Пад ярыну даецца попел з тым вырахаваньнем, што сяўба настане не раней як за тры тыдні. Сыпаць попел паверсе (на ліст) ня радзяць дзеля таго, што незаворываны попел пераманяецца ў скарынку, якая вельмі некарысная і нават проста шкодная для кожнай прарастаючай расьцінкі. На гэктар бяднейшай зямлі даецца попелу 600—800 кілёграмаў, а на багацейшую — ўдвая менш, г. зн. 300—400 кіл.

Попел ёсьць угнаеньнем перад усім паташавым (калійным), але ня мала мае ён у сабе і фосфару. Вырахавана, што кожныя 160 кілёграмаў попелу з дроў могуць дараўняць 32 кілёграмам паташавай солі і гэтулькім-жа кілёграмам супэрфосфату. Колькі гэта каштуе на грошы, хай спраўдзіць кожны паводле рыначнай цаны названых штучных гнаёў: поташу і супэрфосфату.

М. В.



Кніжка - найлепшы прыяцель!

ГАСПАДАРЧАЯ ХРОНІКА.

Колькі ў нас авечак. Падрахована, што на агульны лік авечак у Польшчы 2.500.000 штук; гэтак званыя паўночна ўсходнія, а значна беларускія абшары Віленшчыны, Наваградчыны, Беласточчыны і Палесься маюць 63 проц., ці йнакш кругла 1.375.000 штук. З гэтага толькі няцэлыя 43.000 ў гаспадарках дворных, рэшта — у гаспадарках, што маюць менш 50 гэктараў зямлі.

Новае ападаткаваньне малазямельных. Паводле вестак, Міністэрства Скарбу яшчэ на гэтай сэсіі Сойму мае намер правесьці новае ападаткаваньне малазямельных, на падставе гэтак званых сярэдніх норм, бяз асобнага ў кожным выпадку ўстанаўляньня даходу.

Адначасна мае быць абніжана і вольнае ад ападаткаваньня мінімум гадавога прыходу дагэтуляшніх 1500 зл. да 800 зл.

У зьвязку з гэтым праўдападобна будуць палёгкі для гаспадарак, што будуць магчы выказаць свае ўраходы і расходы на пісьме, г. зн. будуць весьці бугальтэрыю. А знача і тут патрэба вялікая фаховай земляробскай асьветы.

Наша пошта.

Н. Кішко — Каз. Цешымся, што ў Вас наладжваецца праца над самаасьветай. Патрэбныя кніжкі Вам высланы. Дзесятку „Самапомачы“ Вам будзем рэгулярна высылаць пачынаючы з № 1 сёл. Напішэце нам, ці Вы цяпер „Самапомач атрымоўваеце.

Коол. „Поўня.“ Усё прошанае Вам выслана. Дзесятку „Самапомачы“ будзем таксама акуратна высылаць. Пішэце аб жыцьці Вашай коопэратывы.

Б. Казл., С. Лаб—віч, М Мур—ік і Ф. Д—скі: Дзесяткі „Самапомачы“ Вам будуць акуратна пасылацца. Заахвочвайце суседзяў да чытаньня гаспадарскай кніжкі і часапісу. Гэта сягоньня адзіны спосаб падняць нашу гаспадарку, бо школ гаспадарскіх няма, а арганізацыі чужыя ды яны ня гэтулькі дбаюць аб гаспадарку, толькі аб заціраньні нашага нацыянальнага беларускага аблічча. Працуйце.

Ц. М—скі і Р. Ш—ак: атрымалі, дзякуем, часапіс пасылаем. Пашырайце.

Гурток Б.І.Г.іК. з Б. Атрымалі, вышлем дадаткова. Дапоўнеце камплет.

А. Мі—ць. Атрымалі, дзякуем. Аб М. Г—цы нічога ня ведаем. У скорасьці Вам напішам асобнае пісьмо. Прывітаньне.

Шэ—на А. Вельмі шкадуем, што да Вас не даходзіць „Самапомач,“ але мы яе Вам цэлы час акуратна высылаем. Дамагайцеся на пошце і сьлядзеце, ці хто не атрымоўвае за Вас. Калі Вам не хапае якіх нумароў да камплету, пішэце — дапоўнім.

Я. Ч—кі: Калі-ж будзе тое абяцанае? Шкадуем, але на павер даўжэй высылаць ня можам.

УВАГА! *УВАГА!*

Пры рэд. «Самапомачы» ўведзены аддзел праўных парадаў, якім кіруе безінтэрасоўна беларуская адвакацкая сіла. Асобы, якія маюць якіясь пытаньні, павінны іх ясна і выразна напісаць на пісьме і прыслаць у нашу рэдакцыю. Адказы — невялікія будуць друкавацца ў «Самапомачы». На адказы большыя трэба далучыць паштовую марку за 25 грашоў.

Рэдакцыя „САМАПОМАЧЫ“

Pierasyłka apłačana ryčałtam.



CANA NUMARU 40 HRAŠOŬ